Няхай жыве саюз рабочых і сялян!

Паляўнічы Беларусі

№ 6 Ліістапад — Сьнежань
Двохмесячная часопісь
Орган Белнахотсаюзу
Год выданьня другі
1928

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 год . . 1 р. 50 к.
На 6 м-цаў. . — 85 к.
Паасобны № . — 30 к.

АБВЕСТКІ:
Старонка перад тэкстам 100 р.
На апошн. старонк. вокл. 75 р.
Ззаду тэксту . . . 50 р.
Аб прапажы сабак . . 1 р.
Аб прадажы сабак . . 3 р.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, Савецкая. № 71.
Тэлефон—405.

ЗЬМЕСТ: Няхай жыве сусьветны Кастрычнік. Чатыры важных вучасткі—**Міх. Шмідт.** Новы Крымінальны кодэкс аб паляўнічай гаспадаркі—**А. Судакоў**. Состояние Мозырского Окружного Товарищества—**В. Б.** Еще раз о кассах взаимопомощи—**В. С.** Строго соблюдать директивы правительства—**Д—в.** Перспективы развития охотничьего хозяйства—**В. Даньков.** О серебристых лисицах—**Ив. Докудовский.** Сваечасовае пытаньне—**Жук.** Гіне шэрая курапатка—**Там-Аш.** О сроках охоты—**Н. Семевский.** Глисты у собак—проф. **Ал. Макаревский.** Орша, Могилев, Гомель и Минск—не подготовились к полевым пробам—**М. Алексеев.** Воўк (верш)—**М. Хведаровіч.** Осень (стихотворение)—**Теляковский.** Браканьер (апавяданьне)—**А. Кляеўскі.** Вопросы стрелкового спорта—**М. Вилькобриский.** Призы лучшим—**Свой.** Заводим новый отдел—проф. **А. Федюшин.** В утином царстве—**Ник. Филиппович.** Интересная добыча. Защитить лося—**М. Г—ц.** Загранічны пушны рынак. Внематочная беременность у зайчихи и мунификация плода—**В. Глаголев.** Ресторан для собак—**А. М.** Лов крупной рыбы на глубинах озер—**Н. Ф.** Ужение рыбы зимой—**Красс.** Охота в декабре. **Жыцьцё на мясцох. Бібліяграфія. Афіцыйны аддзел. Узносы на самалёт. Адказы на запытаньні.**

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

Мы ўступілі ў 12-ты год існаваньня Савецкае ўлады ў новых, інакшых ад мінулых гадавін, умовах.

За гэты год сусьветны рабочы рух і рэвалюцыйны рух працоўных мас калёній зрабіў далейшыя і буйныя крокі на цярністым шляху да канчатковай перамогі. Клясавыя бойкі і сутычкі патрасьлі на працягу гэтага году ледзь ня ўсе краіны ўсіх кантынэнтаў сьвету. І ўсюды, пачынаючы з далёкай Аўстраліі і канчаючы блізкай нам Заходняй Беларусьсю і Польшчай, масы ішлі пад сьцягамі Камінтэрну. Праўда, гэтыя рухі не прывялі да гэтага часу да перамогі пралетарыяту. Капіталу, пры дапамозе, галоўным чынам, вярнейшых сваіх сабак—цяперашняй сацыял-дэмакратыі—удаецца пакуль што атрымліваць верх у гэтых клясавых бойках. Але нават самы злосны вораг камунізму не адважыцца адмаўляць цяпер гэтага ўсё ўзрастаючага ўплыву камунізму на працоўныя масы ва ўсіх кутках сьвету. Мы з гордасьцю падводзім гэты балянс. Ён стаў магчымым толькі дзякуючы таму, што на аднэй шостай частцы сьвету пасьпяхова вядзе работу па будаўніцтве сацыялізму краіна дыктатуры пралетарыяту, маяк для працоўных і прыгнечаных усяго сьвету. Таму першае слова ў вялікую гадавіну, першы наш лёзунг: за яшчэ большае ўзмацненьне міжнароднай салідарнасьці рабочае клясы, за яшчэ большую ўвагу пралетарыяту да вызваленчай барацьбы ў калёніях! За ўсямернае ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту ў СССР!

Клясавая барацьба абвастраецца ня толькі ў краінах капіталізму. І ў нас, у СССР, на глебе пасьпяховага

прасоўваньня наперад ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, абвастраецца супраціўленьне гэтаму будаўніцтву з боку кулака ў вёсцы, нэпмана і шахцінца—у горадзе. Таму другім нашым лёзунгам павінна быць: за яшчэ большае ўзмацненьне наступленьня на кулака, на капіталістычныя элемэнты гораду! За ўсямернае ўзмацненьне сацыялістычнага сэктару нашае гаспадаркі!

Разьвіцьцё сацыялістычнае будоўлі не праходзіць плаўна. Будаўніцтва сацыялізму гэта перш за ўсё—барацьба. Барацьба адмаўляе спакойную плынь жыцьця. Труднасьці няўхільны. Але воля да перамогі, жаданьне перамагчы труднасьці—адзнакі, заўсёды ўласьцівыя клясе пралетараў. Гэтыя адзнакі павінны цяпер усяляк выхоўвацца. Супроць журбы і панікёрства, за цьвярозую і ўпартую работу па перамозе труднасьцяй! За яшчэ большае ўцягненьне мас у наша будаўніцтва, за сьмелую самакрытыку, за рашучае вылучэньне рабочых і работніц, беднякоў і батракоў на кіруючую работу!—такі павінен быць наш трэці лёзунг.

Ва ўмовах наступленьня буржуазіі на міжнародны рабочы рух, ва ўмовах частковай стабілізацыі капіталізму і росту супярэчнасьцяй паміж капіталістычнымі дзяржавамі заваструецца пытаньне аб новай сусьветнай бойні.

Ліхаманкавы рост узбраеньняў усіх імпэрыялістычных краін, закулісныя махінацыі пад прыкрыцьцём гучных фраз аб міры, ваенныя падрыхтоўкі па ўсёй даўжыні нашай заходняй мяжы—усяго гэтага ні на хвіліну не павінен выпускаць з-пад увагі кожны рабочы, кожны селянін, кожны грамадзянін нашага Саюзу. Палітыка міру—наш стары і сталы лёзунг. Мы яго шмат раз дэманстравалі перад усім сьветам. Але мы ня сьлінявыя пацыфістыя і не наіўныя талстоўцы. Таму на пагрозу нападу на першую краіну Саветаў мы адказваем і адкажам далейшым рашучым узмацненьнем нашай слаўнай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. Увага, дапамога, любасьць працоўных да нашай Чырвонай арміі—такі наш чацьверты лёзунг.

СССР—праваобраз будучай сям'і народаў. Толькі ў СССР няма нацыянальнага прыгнечаньня. Толькі пры дыктатуры пралетарыяту, аб'яднаўшыся ў адзін саюз, раней прыгнечаныя нацыянальнасьці атрымалі магчымасьць свабодна разьвівацца, свабодна будаваць сваю культуру.

Узаемнае падтрыманьне, дапамога і сувязь паміж народамі, якія добраахвотна аб'ядналіся ў СССР, зьяўляюцца найлепшай гарантыяй гэтага свабоднага разьвіцьця кожнай з нацыянальнасьцяй.

Таму ў дзень гадавіны Кастрычніка, які даў нацыянальную і сацыяльную свабоду раней прыгнечаным нацыянальнасьцям,—наш лёзунг:

За далейшае ўзмацненьне салідарнасьці, якая злучае народы СССР!

За далейшае эканамічнае і культурнае разьвіцьцё нацыянальных рэспублік!

Усе нашы труднасьці, як замежнага парадку, так і ўнутранога, зусім не зьяўляюцца непераможнымі. Пасьпяховая і хутчэйшая іх перамога залежыць ад правядзеньня правільнай, ленінскай палітыкі. Найбольш поўнае сваё выяўленьне гэта адзіна правільная палітыка краіны, у якой будуецца сацыялізм, знайшла ў пастановах 15-га зьезду ЎсеКП(б). Таму ў дзень XI гадавіны Кастрычніка мы з усёй рашучасьцю павінны заклікаць масы да няўхільнага правядзеньня ў жыцьцё гэтых пастаноў:

За цьвёрды курс на індустрыялізацыю! За хутчэйшы ўздым цяжкай прамысловасьці! За калектывізацыю вёскі!

РАСПАЧНЁМ КУЛЬТУРНА-АСЬВЕТНУЮ ПРАЦУ СЯРОД ПАЛЯЎНІЧАЕ МАСЫ!

Міх. Шмідт.

Чатыры важных вучасткі працы.

Насьпелае пытаньне.

Разгортваньне работы нашай каапэрацыі за апошнія часы, усё большы ўзрост членства высоўвае ва ўсю шырыню перад намі пытаньне вядзеньня культурна-масавай работы сярод каапэраванай масы.

Даць ацэнку правадзімай на мясцох да гэтага часу культурна-масавай работы мы ня можам таму, што ў нас няма ніякіх зьвестак, ніякіх справаздач аб апошняй, а калі зрабіць вывад на аснове допісаў нашых ахоткораў, дык прыходзіцца сказаць адно: культмасавай работы на мясцох ня было і няма.

Між тым, VII Усебеларускі Зьезд упаўнаважаных (май 1927 году) па справаздачы Ц. П. даў наступную дырэктыву:

„Узмоцніць культурна-асьветную работу ў цэнтры, прапанаваўшы ў акругах стварыць пры Акруговых Праўленьнях чытальні, выдаваць насьценгазэты, а на раёнах—куткі па ахотаведаньню пры народных будынках і хатах-чытальнях...“

Прайшло больш за паўтара гады, а намі амаль што нічога ня зроблена, каб выканаць дырэктывы Зьезду ўпаўнаважаных.

Далей так працягвацца не павінна. Паляўніцкая каапэрацыя, якая налічвае зараз каля 30.000 членаў, павінна разгарнуць культурна-масавую працу. Зараз склаліся ўсе ўмовы, якія спрыяюць вядзеньню гэтай працы, і асабліва зімовы пэрыяд, калі большая частка вясковых паляўнічых можа займацца ў розных гуртках, наведваць лекцыі і г. д.

На апошнім пасяджэньні Цэнтральнага Праўленьня быў аформлен культурны п/аддзел пры Цэнтральным Праўленьні, а зараз задача Акруговых Праўленьняў арганізаваць такія п/аддзелы пры Акруговых Таварыствах і даць дырэктывы мясцом аб вылучэньні спэцыяльных таварышоў з членаў райбюро для вядзеньня гэтай работы па раёнах.

Але-ж гэта ня ўсё. Разгарнуць культурна-масавую працу можна будзе толькі тады, калі на мясцох навокал яе будзе створана агульнаграмадзкая думка, калі ўсе нашы фонды на культпатрэбы, якія да гэтага часу сабіралася ў акругох, будуць скарыстаны толькі для вядзеньня культурна-масавай працы.

Мы лічым, што ў гэту зіму трэба будзе абмежавацца толькі ўтварэньнем ахоткаапэрацыйных гурткоў і паляўнічых куткоў пры хатах-чытальнях і клюбах, прычым, як вопыт, трэба будзе арганізаваць ня больш, як пяць гурткоў у кожным раёне. Гурткі павінны працаваць па праграме, якая разаслана на месцы. Асаблівую ўвагу трэба будзе зьвярнуць на падбор кіраўнікоў гурткамі, дзеля чаго трэба будзе зьвярнуцца за дапамогаю к саадпаведным партыйным і прафэсыйным арганізацыям.

Пытаньне вядзеньня культурна-масавай работы сярод паляўнічых—сваечасовае. Задача месц — узяцца за яе вядзеньне, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на вясковых паляўнічых, прыцягнуўшы да гэтай работы і сялянства, якое намі не каапэравана.

* *

Нясеце пушніну ў сваю каапэрацыю.

Аб пушных загатоўках мы ўжо пісалі, але-ж зараз, калі сэзон загатовак наступіў, нам яшчэ раз трэба спыніцца на гэтым пытаньні.

Лік асноўных пушна-загатаўцеляў хоць і скараціўся, але-ж за гэта павялічыўся лік дзяржаўных загатаўцеляў. Бязумоўна, што і прыватны скупшчык таксама будзе дзейнічаць; ён будзе ўносіць блытаніцу на загатоўчым рынку ў цэнах і спосабах загатоўкі. У прыватніка няма грунтоўнае цаны, ён, карыстаючыся незнаёмствам паляўнічага з цэнамі,

будзе на якой-небудзь дробязі даваць лішні рубель, а на добрай пушніне не даплаціць і возьме першы сорт за другі.

Паляўнічая каапэрацыя плаціць за пушніну грунтоўна ўстаноўленыя цэны. Тут ашуканства ня можа быць. Пасьля рэалізацыі пушніны каапэрацыяй прыбытак разьмяркоўваецца па ўсім відам каапэрацыйнай работы (аднаўленьне паляўнічае гаспадаркі, арганізацыйная праца, культурна-масавая і г. д.), а частка прыбыткаў разьмяркоўваецца паміж здатчыкамі пушніны. А калі паляўнічы здае сваю пушніну прыватніку, дык і прыбытак застаецца толькі прыватніку.

Калі ў мінулым годзе былі некаторыя недарэчнасьці ў нашых пушных загатоўках з боку нашае каапэрацыі, дык гата толькі таму, што ў нас яшчэ ня было досыць вопыту ў гэтай рабоце. Мы лічым, што на аснове вопыту мінулага году нашы загатаўцелі шырэй разгарнуць сваю дзейнасьць.

Абавязак кожага паляўнічага—здаваць здабытую ім пушніну толькі ў сваю каапэрацыю. Трэба памятаваць, што аднаўленьне паляўнічай гаспадаркі, а разам з гэтым разгортваньне ўсёй нашай работы, знаходзіцца ў цеснай сувязі з загатоўкамі.

Вось з гэтага павінен выходзіць кожны паляўнічы ў паасобку, кожнае бюро райкаляктыву і акруговае праўленьне таварыстваў у сэзон пушных загатовак гэтага году.

* * *

Чужы элемэнт—не прапушчаць у саюз.

Згодна дырэктыў апошняга пленуму ўпаўнаважаных, цэнтральнае праўленьне Беларускага прамыслова-каапэрацыйнага саюзу паляўнічых пастанавіла: „абвесьціць з 1-га лістапада па 1-е студзеня перарэгістрацыю ўсіх членаў саюзу паляўнічых“.

Асноўная мэта перарэгістрацыі гэтага году—якаснае выяўленьне паляўнічых. Гэта значыць, што мы павінны падыходзіць да гэтае работы з уважлівасьцю, лічучы яе не работаю па тэхнічнаму запаўненьню анкет, а адказнай, не дапушчаючы ў нашы рады чужы нам элемэнт: кулацтва, падсудных і іншых, якія пазбаўлены правоў.

Анкета, па якой будзе праводзіцца перарэгістрацыя, упаўне спрыяе праўдзеньню ў жыцьцё пастаўленай перад намы мэты.

Дасьвядчаць аб тым, што пералічаная вышэй катэгорыя людзей перашкаджае нам у рабоце і што яна не павінна быць у нашых радох, многа ня прыходзіцца. Аб гэтым можна прывесьці факты з апошніх перавыбараў бюро райкаляктыву ў Копыльскім раёне (Менакругі), дзе кулацтва заявіла:

— Беднякоў ня трэба абіраць у бюро, бо калі ў іх будзе растрата, дык ня будзе з чаго ўзыскаць, таму ў бюро райкаляктыва трэба абіраць кулакоў.

Факт гэты лішні раз сьведчыць аб тым, што кампанія па перарэгістрацыі—справа сур'ёзная і адказная, бо магчыма праніканьне чужога нам элемэнту ў арганізацыю працоўных.

Правільна паступіла бюро Копыльскага райкаляктыву паляўнічых, калі яно, пасьля такога выступленьня, выключыла больш як 25 проц. кулацтва з сваіх радоў.

Калі гэта мерапрыемства ў штодзенна правадзімай намі працы не ажыцьцяўлялася, дык яно павінна ажыцьцявіцца зараз у кампаніі па перарэгістрацыі.

Кампанія па перарэгістрацыі павінна быць масавай. Батрацтва, беднацтва і серадняцтва павінна памагчы ў гэтым.

Чужы элемэнт не павінен пралезьці ў нашы рады.

* * *

Кожны паляўнічы—павінен чытаць свой часопіс.

Лік падпішчыкаў на „Паляўнічы Беларусі“, які зараз выяўляецца ў 13.000, гаворыць за тое, што часопіс заваявала аўторытэт сярод паляўнічае масы і зьяўляецца сапраўдным спадарожнікам кожнага паляўнічага.

Такі вялікі тыраж паставіў перад намі пытаньне выданьня часопісу штомесячна, палепшыць яго зьмест.

Побач з гэтым, стаіць задача далейшага павялічэньня ліку падпішчыкаў.

Мы ў сваіх радох налічваем 30.000 членаў, а таму наша задача састаіць у тым, каб ня менш 75 проц. паляўнічых чытала свой часопіс.

Бязумоўна, што пры штомесячным выданьні часопісу, апошні будзе своечасова рэагаваць на тыя ці іншыя злосныя пытаньні, якія цікавяць чытача і якія не маглі да гэтага часу адбівацца ў часопісу толькі таму, што апошні выходзіў адзін раз у два месяцы.

Штомесячнае выданьне часопісу выклікае неабходнасьць павялічэньня падпіснае платы, таму гадавая падпісная плата на 1929 год будзе замест паўтара рублі два рублі, але-ж мы лічым, што гэта ня спыніць выкананьня паўстаўленых задач далейшага росту тыража, задачы далейшага прасоўваньня часопісу ў гушчу паляўнічае масы.

Выканаем лёзунг Беларускага Кааперацыйна-Прамысовага Саюзу Паляўнічых—„75 проц. паляўнічых павінна чытаць свой часопіс".

А. Судакоў.

Новы Крымінальны Кодэкс аб паляўнічай гаспадарцы.

Яшчэ ў № 5 „П. Б." за лістапад 1927 году, мы разглядалі праэкт Крымінальнага Кодэксу БССР. К сёнешняму дню, мы можам даць аналіз тэй працы, якую прарабіла апошняя сэсія ЦВК па Крымінальнаму Кодэксу, у прыватнасьці таго месца, якое непасрэдна датычыцца паляўнічай гаспадаркі. Новы Крымінальны Кодэкс шмат чым адрозьніваецца ад старога ня толькі ў яго асновах, але-ж і ў частцы, якая датычыцца паляўнічай гаспадаркі. Гэта зусім зразумела, бо жыцьцё ідзе ўперад, эканоміка БССР, як і ўсяго Саюзу, значна вырасла і патрабуе зьмены нашага заканадаўства. Лічбы загатовак пушніны па БССР у апошнія гады яскрава гавораць аб гэтым. А калі гэта так, дык патрэбны мерапрыемствы, якія-б дапамаглі разьвіцьцю паляўнічае гаспадаркі, бо паляваньне ў нас не зьяўляецца пацехай групак — прывілеяванага саслоўя, як гэта было раней, а іграе значную ролю ў сыстэме нашае кааперацыі.

Вынікам такога становішча і зьявіліся пастановы апошняй Сэсіі ЦВК аб паляўнічай гаспадарцы. Калі ў мінулым Крымінальным Кодэксу мы мелі толькі адзін артыкул (99), у якім паміж іншымі відамі злачынства, указывалася і аб паляўнічай гаспадарцы; новы Кодэкс нам дае тры самастойных артыкулы, якія бяруць пад сваю ахову гаспадарку і ахопліваюць амаль усе віды злачынстваў, якія разбураюць гаспадарку; апроч гэтага, мы маем каля 5-ці артыкулаў, якія косвенна таксама датычацца паляўнічай гаспадаркі.

Для большай нагляднасьці і зразуменьня, прывядзем першыя тры артыкулы ў прынятай рэдакцыі:

„125. Паляваньне на асабліва каштоўных зьвяроў, напрыклад, бабра, зубра, лося і іншых, калі яно забаронена, альбо паляваньне і рыбная лоўля ў заказьніках і запаведніках, а таксама сыстэматычнае паляваньне і рыбная лоўля без належнага дазволу ці ў забаронены час, альбо недазволенымі прыладамі і спосабамі, выклікаюць:—

штраф да пяцісот рублёў альбо прымусовыя работы да аднаго году, альбо пазбаўленьне волі без строгай ізаляцыі на такі самы тэрмін з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках незаконна здабытага".

Што новага ў гэтым артыкуле? Па-першае,—забарона паляваньня на асабліва каштоўнага зьвера. Зразумела, што, разглядаючы каштоўнага зьвера, мы ў першую чаргу павінны браць умовы і становішча паляўнічае гаспадаркі на Беларусі. Артыкул пералічвае гэтага зьвера і адначасова дае шырокае яго прымяненьне ў залежнасьці ад умоў, дзе гаворыцца „і іншых". Такім чынам, пры ўстанаўленьні забароны, напрыклад: выдры, альбо куніцы, ці яшчэ каго, зьнішчэньне гэтага зьвера без зьмены артыкула, будзе выклікаць санкцыю 125 арт. Крымінальнага Кодэксу, гэта значыць штраф 500 р., ці адзін год прымусовых работ, альбо зьневальненьне, бо артыкул робіць ссылку на спэцыяльны закон.

Далей, артыкул устанаўлівае гэтую-ж санкцыю ў заказьніках і запаведніках. Гэтая частка артыкула яшчэ больш каштоўна для нашай палёўнай гаспадаркі, бо мы ня маем ніводнага добрага заказьніка, яны амаль усе толькі на паперы, так як паляваньне там каралася ў адміністрацыйным парадку, а гэта скарыстоўвалі браканьеры; значыць, усялякі, нават і першы выпадак паляваньня ў заказьніках—цягне за сабой санкцыю 125 арт. Гэта даказвае наколькі ўрад рашуча стаў на абарону паляўнічае гаспадаркі.

Трэцяй часткай гэтага артыкулу ідзе „сыстэматычнае" паляваньне альбо рыбная лоўля, без належнага дазволу ці ў забаронены час. Як трэба прыстасоўваць гэту частку артыкулу ў практыцы? Калі асоба, якая парушае правілы паляваньня, нават злоўленая ў першы раз, павінна быць аддана пад суд. Раней такія выпадкі разглядваліся ў адмпарадку. Закон асобна агаворвае паляваньне недазволенымі прыладамі і спосабамі; для праданьня суду тут не патрэбна сыстэматычнасьць, бо гэта адзін з відаў, паляваньня, якія разбураюць гаспадарку.

Наступны артыкул, які ў свой час быў прадметам абгаварэньня,—гэта аб сьвядомай куплі альбо збыту пушніны, здабытай праз незаконнае паляваньне.

„126. Купля, збыт альбо правоз здабытай пушніны праз незаконнае паляваньне (125 арт.) выклікае:—

штраф да пяцісот рублёў альбо пазбаўленьне волі бяз строгай ізаляцыі да аднаго году з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках незаконна здабытага".

Гэта ўноў уведзены від забароны, але-ж ён зьяўляецца адным з рэальных, адным з карысных для паляўнічае гаспадаркі. Правільнае і рашучае правядзеньне гэтага артыкула ў жыцьцё дасьць магчымасьць добра ўдарыць па злоснаму браканьеру, а таксам адаб'е ахвоту і ў прыватніка мець сувязь з браканьерам, які спрыяе браканьерству. У практыцы мы мелі выпадкі, калі нават нашы дзяржаўныя і каапэрацыйныя загатаўцелі, у час „ажыятажу", былі зьвязаны з браканьерамі і загатаўлялі пушніну, забароненую да адстрэлу, як бабра, вавёрку і выдру ў забаронены год і г. д.

Апошні арт., які больш за ўсіх адносіцца да паляўнічае гаспадаркі, мае на ўвазе ня толькі барацьбу з парушэньнямі ў межах БССР, але-ж і па ўсяму Савецкаму Саюзу. Ён трактуе:

„128. Увоз або вываз скурак марскіх коцікаў альбо марскіх баброў, кавалкаў альбо цэлых, выробленых альбо нявыробленых, бяз плёмб і клеймаў ці без дазваляючых іх вываз дакумэнтаў ад належных органаў улады Саюзу ССР, ці чужаземных, якія сьведчаць, што скуркі здабыты законным парадкам, выклікаюць:—

штраф да дзесяці тысяч рублёў альбо пазбаўленьне волі бяз строгай ізаляцыі да аднаго году з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках такіх скурак".

Гэты артыкул вельмі карысны і ва ўмовах БССР. Па-першае, мы вядзем барацьбу з зьнішчэньнем гэтага вельмі каштоўнага зьвера ў саюзным маштабе, а па-другое, што ў апошні год у нас разьвіваецца наш унутраны гандаль выробленымі скур-

камі, і гандаль гэты вядзецца нашай каапэрацыяй. Зразумела, што прыватнік супрацівапастаўляе сябе каапэрацыі, бязумоўна, пастараецца пашырыць незаконнае здабыцьцё вырабленых скурак, як шлях больш дзяшовы і для яго карысны; нам належыць за гэтым сачыць і весьці барацьбу.

Што-ж павінны зрабіць члены Саюзу Паляўнічых для таго, каб гэты новы закон прынёс карысьць? Практычныя мерапрыемствы павінны быць наступныя:

1. Строгае выкананьне правіл паляваньня з боку самых паляўнічых.

2. Рашучая барацьба з браканьерствам, для чаго належыць:

а) ва ўсіх калектывах, як на Бюро, так і на агульных сходах, распрацаваць новы закон з мэтай азнаямленьня ўсіх паляўнічых;

б) выпрацаваць практычныя мерапрыемствы па правядзеньню ў жыцьцё гэтага закону;

в) узяць на вучот усіх браканьераў і ўстанавіць спэцыяльны нагляд за іх дзейнасьцю;

г) аб усялякіх парушэньнях правіл паляваньня і новага закону належыць хутка давадзіць да ведама калектыву паляўнічых, сельсавету, райміліцыі, РВК, сьледчага ці пракурора;

д) дамагацца перад судовымі органамі, аб допуску грамадзкіх абвінавайцаў з боку Саюзу па крымінальным справам і, апрача крымінальнай адказнасьці, прад'яўляць грамадзянскія зысканьні за прынесеныя страты паляўнічай гаспадарцы.

3. Разам з агульна культурна-выхаваўчай працай, весьці растлумачальную працу сярод насельніцтва аб новым законе. Для чаго неабходна скарыстоўваць: сход сялян, клюбы, хаты-чытальні, гутаркі з сялянамі і г. д. Апрача членаў саюзу, у гэтую працу павінны быць уцягнуты: лясная варта і культурныя сілы вёскі.

Пры правядзеньні гэтых аснаўных мерапрыемстваў новы закон знойдзе сваё месца, і паляўнічая гаспадарка будзе адноўлена.

В. Б.

Состояние Мозырского Окружного Товарищества.

(*По материалам обследования*).

Мозырский округ является несомненно наиболее богатым по охотничьему богатству из всех других округов Белоруссии. Сплошные массивы леса, многочисленность озер и болот делают охоту весьма разновидной и добычливой. Не смотря на все эти данные, этот уголок Белоруссии является совсем не изученным и сведения о нем можно получить только из рассказов и наблюдений охотников. Письменного материала совершенно не имеется; нет и карты охотничьего хозяйства.

Совершенно не приступили к организованному ведению охотничьего хозяйства, нет ни заповедников, ни заказников.

На ряду с охотой имеются большие возможности к организации рыбоводства. В 1928 году товарищество значительно увеличило эксплоатацию водоемов (с 601 руб. платы за аренду до 11124 руб.). Рыболовная секция об'единяет десять артелей с 58 членами и 70 человек любителей-одиночек.

Рыбное хозяйство, при рациональном и правильном ведении его, может служить довольно значительной материальной базой для развития охотничьего хозяйства. На этих важнейших участках работы не было сосредоточено внимания Товарищества в течение целого ряда лет.

Делу охотничьего хозяйства не уделяется никакого внимания и сейчас. Средства в размере 1500 р., предназначенные по смете 1927-28 г., израсходованы целиком на административные нужды, в смете 1928-1929 года, не смотря на рост расходной

части сметы на 42 проц., на охотничье хозяйство *не выделено ни копейки*.

Не сделано ничего Правлением и в остальных отраслях работы, как кровное собаководство, полевые испытания, выводки и т. д. Стрелковое дело также поставлено неудовлетворительно: в истекшем году проведено в городе и в районах всего 6 стрелковых состязаний, к коим не проявлено достаточного интереса со стороны охотничьей массы, что можно судить из того, что целый ряд организуемых коллективами стрельб срывались за неявкой.

Борьба с хищниками ведется весьма неудовлетворительно. План, выработанный окружным правлением, выполнен на 30 проц. Отсутствие учета результата, истребления хищников, свидетельствует о том, что эта работа не носит характер планомерный и организованный.

Отличительной особенностью Мозырского округа является отсутствие ведения работы внутри союзной массы. Взять хотя-бы такие примеры, как распространение подписки на журнал „Паляўнічы Беларусі“, (371 подписчик на 3610 членов товарищества, что составляет 10 проц.), сбор средств на самолет „Охотник Белоруссии“, давший всего 134 р. 60 к. (состоящий из взносов Правления и поступлений по вызовам работников руководящих органов Союза), то становится совершенно ясным, что никакой культурной, внутрисоюзной работы среди массы нет.

Затянувшаяся перерегистрация членов Союза и наличие многочисленных случаев залеживания заявлений в коллективах, с декабря, января месяца, выписка билетов в Окружном Правлении, задерживающаяся на 2—3 месяца, может служить только условием на внедрение недисциплинированности среди союзной массы, отсюда и борьба с браконьерством является весьма наивной вещью, а если таковая ведется милицией, то она не всегда достигает тех целей, которые ставит себе борьба с браконьерством, о чем примером могут служить отобранные ружья стоимостью в 50 к.

Отсутствие социально-имущественного учета и точного количественного, как в Окружном Правлении, так и коллективах, показывает, что вопросу качественного состава союза, что является особенно важным в охотничьей кооперации, не уделено никакого внимания и эта задача является совершенно не осознанной. Нет работы по привлечению молодежи, попытка организации кружка молодых охотников так и осталась попыткой.

Отсутствие работы по организации и вовлечению охотничьего актива, привлечению к практической работе отдельных охотников-активистов, накладывает отпечаток на всю деятельность Окружного Товарищества и коллективов. Платный состав работников весьма малочислен, а выборный-же состав не участвует почти совсем в практической работе, отсюда результат, что деятельность Товарищества и коллективов сводится в основном к выдаче членских билетов, взиманию членских взносов и продаже охотничьих припасов.

Товарищество должно сделать в этом направлении решительный перелом, должно ясно себе представить, что одними платными работниками без помощи всего выборного состава и союзной массы проводить работу нельзя, что любая общественная организация должна и может строить свою работу только на основе широкой общественной инициативы.

Не жалея сил и средств—надо привлечь охотников к практической работе, расширить созыв общих собраний коллективов, практикуя созыв охотников по сельсоветам, по участкам (2—3 сельсовета), постановку докладов, бесед об охотничьем хозяйстве, отчетов о работе товарищества, организовать участие всех членов союза в подписке на журнал и создание охоткоровского актива.

Не смотря на неудовлетворительное состояние основных отраслей работы, торговая деятельность Това-

рищества является также не блестящей. „Замечательной“ явилась деятельность агента Рабиновича, принятого Правлением на службу вопреки решению Пленума. Им было заготовлено пушнины на 2836 р. и принесено 1204 руб. накладных расходов или 42,45 проц. Помимо этого он проделывал и иные номера—скупал у уполномоченных заготовленную ими пушнину, вербовал крестьян для покупки у охотников пушнины, снабжая порохом и дробью. Кстати не лишним будет уведомить читателей, что Рабинович в настоящее время арестован.

В текущем году была обнаружена растрата, совершенная секретарем Правления Кульбицким, в размере 1100 рублей, недостача денег оказалась и в кассе, находившейся в ведении председателя правления Бобрика. Последний передавал кассу во время своих частых отлучек Кульбицкому, не проверяя ее, а „удивший рыбку в мутной воде“ „делец“ Кульбицкий пользовался кассой, как своим карманом, помимо этого вносил хаотичность в денежную и товарную отчетность, считая, что это являлось наиболее надежным средством для скрытия производимых им позаимствований из общественной кассы.

Насколько отчетность находилась в беспорядочном состоянии, видно из того, что Окружная Ревизионная Комиссия, работавшая более 3-х месяцев (февраль—май месяцы), пришла к заключению, что произвести поверку совершенно невозможно и сочла необходимым начать бухгалтерские записи заново, благодаря чему, бухгалтерские проводки и сейчас отстают на полтора месяца.

Следует отметить „подвижность“ мозырских следственных органов, не сумевших в течение 9 месяцев закончить следствие. И Кульбицкий продолжает гулять на свободе.

Выводы напрашиваются сами собой. Доизбранное Правление (25 августа) должно, не покладая рук, начать работу внутри союзной массы и привлечения из нее практических помощников. Должна быть начата работа по развертыванию действительной самокритики, как наиболее действенного средства к выращиванию и воспитанию актива. Товарищество должно начать работу немедля по организации охотхозяйства, его изучению, привлечь к этой работе всю союзную массу.

В. С.

Еще раз о кассах взаимопомощи.

(*Ответ на заметку т. А. Федосеева „Я за создание фонда помощи“ „П. Б“. № 1, 1928 г.*).

В своей заметке „Я за создание фонда помощи“ А. Федосеев приводит случай, что когда убили нашего охотника т. Сандовича, семья его осталась необеспеченной даже на первый случай. Отсюда автор и делает вывод, что нужно создать при охоткооперации какой-то особый „фонд помощи“ со взысканием по 50 коп. от каждого члена Союза Охотников на первый раз, и по 10 к. впоследствии, для пополнения этого фонда.

Не говоря уже о том, что такая организация фонда помощи нежизненна, ибо так, как рекомендует т. А. Федосеев выдавать при несчастных случаях семье по 500 руб. то нужно будет в таких случаях брать с охотников не 10 коп. в год, а значительно больше, ибо несчастных случаев смерти наших членов Союза в год бывает не 4—5, как приводит А. Федосеев, а значительно больше, и если уже оказывать помощь, то нужно оказывать ее всем семьям членов нашего Союза, независимо от того, случился ли с ним несчастный случай на охоте, или он умер от тяжелой болезни.

Если вопрос ставится так, то потребуется значительная сумма средств

для оказания этой помощи, ибо каждая семья, оставшаяся без кормильца, будет вправе пред'явить Союзу свои претензии на оказание помощи. А таких претензий будет много. Только из одного минского товарищества охотников возвращается пай в связи со смертью от 10 до 12, а по всей Белоруссии это количество увеличится почти в 8 раз. Поэтому, при всем желании и единодушии, вся 30-тысячная организация членов нашего Союза не в силах будет оказывать этой помощи, а, главное, что для таких случаев существуют страховые органы.

Я отнюдь не против того, чтобы среди нашей охотничьей организации не было товарищеской солидарности, ибо охотничья семья всегда была более сплоченной и организованной и останется сплоченной, но, вместе с тем, возражаю против создания каких-то особых „фондов помощи". В некоторых наших окружных товариществах существуют кассы взаимопомощи, при которых по уставу предусматривается „Фонд безвозвратных ссуд" и работу последних надо оживить.

Мне помнится, как в 1927 году Правлением Белкохотсоюза был разработан типовой устав кассы взаимопомощи и на Всебелорусском с'езде был поставлен вопрос об организации единой кассы взаимопомощи во всебелорусском масштабе с отделением в каждом округе и районе, признали это тогда неприемлемым, боясь пристрастия работников Ц. П. к какому-нибудь одному округу и решили организовать кассы при каждом окружном правлении. Я тогда еще возразил этому, мотивируя это тем, что многие окружные правления мало вообще интересуются работой в Союзе охотников, а им еще надо будет браться за организацию касс взаимопомощи, которая потребует значительных сил, энергии и затраты времени.

Теперь мы на практике видим, что, кроме Мозырского округа, ни одно товарищество не организовало у себя кассы взаимопомощи, и вся подготовительная работа правления Белкохотсоюза пошла насмарку, а работа была проделана большая. В Мозырском товариществе касса была организована и, конечно, кроме благоприятных результатов, плохого ничего нет, ибо касса об'единила вокруг себя свыше 1800 членов нашего Союза, поэтому из опыта работы Мозырской окружной кассы взаимопомощи нужно взять пример.

Низовая масса членов нашего Союза должна сказать своим правленческим работникам, что нужны не вымышленные случайные „фонды помощи", а должны быть организованы кассы взаимопомощи при всех окружных товариществах, или должна быть организована для большей мощности одна охотничья касса взаимопомощи при правлении Белкохотсоюза, которая предусматривала-бы не только оказание помощи после смерти охотника, но оказала-бы ее тогда, когда охотник попадает в крайне тяжелое материальное положение.

Я считаю, что в 1929 году кассы взаимопомощи должны быть организованы везде.

Надеюсь, что коллективы на своих общих собраниях обсудят этот вопрос и пришлют в редакцию журнала свои постановления.

ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК 1917 ГОДУ ПАЛАЖЫЎ ПАЧАТАК ПЕРАМОГАМ СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ. НЯХАЙ ЖЫВЕ КАСТРЫЧНІК!

Д—в.

Строго соблюдать директивы правительства.

По директивам ЭКОСО и Наркомторга, пушная кампания этого года проводится под лозунгом *восстановления охотничьего хозяйства и способствования дальнейшего его развития.*

Установлены твердые цены на пушнину, которые действительны на весь сезон, и только в марте месяце 1929 года будут понижены на 15%. В этом сезоне пушнина расценивается:

Лисица	**18 руб.**
Волк	**25 руб.**
Рысь	**35 руб.**
Барсук	**2 руб.**
Норка	**11 руб.**
Хорь темный	**4 руб. 40 к.**
Заяц-русак	**60 к.**
Заяц-беляк	**40 к.**
Горностай	**2 руб. 20 к.**
Ласка	**45 к.**
Крот	**30 к.**
Кролик	**80 к.**
Кошка дом.	**1 руб.**
Собака крупная	**1 руб. 20 к.**
„ средн.	**1 руб.**
„ мелкая	**80 к.**

На выдру цена не установлена. Для Витебского и Полоцкого округов цена на лисицу установлена 22 рубля.

Примечание. Цены, указанные здесь, исключительно на первые сорта; остальные сорта будут расцениваться согласно стандарта Наркомторга СССР.

На белку и куницу, как запрещенную к отстрелу, цены не установлены. Пушная Конвенция при Наркомторге БССР постановила: „Считаясь с существующим постановлением о запрещении отстрела белки и куницы, обязать всех заготовителей дать указания своим заготпунктам не закупать шкурок упомянутых видов зверя. Поручить Союзу Охотников путем публикации в печати довести до сведения как членов Союза Охотников, так и прочего населения, что отстрел белки и куницы запрещен, и что лица, занимающиеся как отстрелом, так куплей и продажей, будут привлекаться к ответственности в порядке существующих законоположений". (Прот. №5) К. С. (III п. 4 и 5).

Согласно Инструкции Наркомторга БССР, запрещается основ ым заготовителям скупка пушнины от частников, а также использование специальных прасолов и раз'ездных коробейников.

Вообще запрещена закупка пушнины частным лицам. Разрешена скупка пушнины только четырем основным заготовителям — Госторгбелу, Охотничьей Кооперации, Белкоопсоюзу и Белсельсоюзу.

Согласно постановления ЭКОСО при СНК БССР от 15 октября сего года, вся прибыль, полученная основными заготовителями, от операции по пушным заготовкам, в первую очередь, идет на восстановление охотничьего хозяйства.

Правительственные органы в этом сезоне сделали все, чтобы не было на рынке ажиотажа, чтобы прибыль не поступала в карманы частников-спекулянтов, а чтобы пошла на восстановление охотничьего хозяйства.

Мы, доводя до сведения об этом охотничьей массы и населения Белоруссии, ставим в известность, что, со своей стороны, будем применять к членам Союза Охотников, за нарушение данных правительством постановлений, самые суровые меры, а к частным лицам и другим нарушителям существующих положений о заготовках—новую статью Уголовного Кодекса.

Мы считаем, что все сознательные члены нашего Союза будут нам в этом способствова ь и сообщать как в окружные правления, так и в Белкохотсоюз о всех нарушениях.

Районным коллективам необходимо этот вопрос согласовать с РИК'ами и выделить необходимое количество наблюдателей на местечковых рынках, а также способствовать задержанию лиц, вывозящих за пределы Белоруссии запрещенные к отстрелу белку и куницу.

В. Даньков.

Перспективы развития охотничьего хозяйства*).

В СВОЕЙ статье (№ 4 „Паляўнічы Беларусі“) я касался вопроса исключительно развития охотничьего хозяйства в природных его условиях, то-есть проведение тех мероприятий, которые обеспечили бы нам возможность приостановить дальнейшее хищническое разрушение и тем самым перейти на плановое промышленное звероводство, а также и плановое ведение всего охотничьего хозяйства, заключающееся в *плановом отстреле пушного зверя и пернатой птицы* и на очередную эксплоатацию охотничьих участков.

В настоящей статье я хочу вынести на обсуждение широких охотничьих масс, а также заинтересованных советских органов и общественности те мероприятия, намеченные пятилетним планом восстановления охотничьего хозяйства в части промышленного звероводства, то-есть разведение наболее ценных пушных пород зверя в неволе, путем организации целого ряда питомников, которые послужили-бы рассадником продвижения этих зверей в прирученном виде, в более мелкие как коллективные питомники, а также и отдельные крестьянские хозяйства

Пятилетним планом предусмотрена организация четырех культурно-опытных охотничьих хозяйств, на территории не меньше 10 тысяч гектаров каждое. В этих хозяйствах должен быть широко развит подсев кормовых трав, устройство защитных мест, хорошо организованная подкормка зверя, а также и подсадка тех видов зверя, кои значительно уменьшились или совершенно вывелись.

В этих культурно-опытных охотничьих хозяйствах будет установлена специальная охотничья стража и научные консультанты, которые при повседневной практической работе будут изучать охотничью фауну и динамику размножения зверя на свободе.

Кроме этого, при этих культурно-опытных охотничьих хозяйствах будут организованы питомники более ценных пушных зверей, как-то: серебристо-черной лисицы, ондатры (американской выхухоли), кроликов, песцов, куницы, норки и выдры.

Серебристо-черную лисицу, ондатру и кроликов решено сразу-же приступить к полному их разведению в питомниках, так как опыт по разведению этого вида зверей есть. Вопрос теперь о климате и о среднем количестве осадков, ибо для выхода хорошей пушнины — меха влияет главное не зимняя температура, то-есть холода, а влажность лета. Для сравнения средней температуры, я приведу выдержку из доклада проф. БГУ т. А. Федюшина:

*) Начало см „П. Б.“ № 4.

На 4 Всебелорусском с'езде нашего Союза т. А. Федюшин, сравнивая климатические условия Белоруссии с островом „Принца Эдуарда" (Северная Америка), родиной серебристо-черной лисицы и главным центром пушного звероводства (С. А.), указал, что „средняя годовая температура Мозырского и бывш. Калининского округов равна 6,9°, в Василевичах 6,7°, в Могилеве 6,7°, в Минске 5,7°, в Витебске 5°". На островах „Принца Эдуарда" средняя зимняя температура минус 8°, в Минске в декабре средняя температура минус 9,3°, в феврале минус 9,9°. (Здесь нужно сделать маленькое смещение потому, что исчисление сделано по старому стилю, так что минус 9,3° и 9,9° передвигается в сторону февраля и марта. А. Ф.). В Борисове в декабре минус 9,9°, в январе минус 9,8°, в феврале минус 7,3° в то время, как на островах „Принца Эдуарда" температура минус 8°, в Минске минус 8,8°, а в Борисове 9° почти никакой разницы; значит разница только в Минске 0,8°, в Борисове на один градус. Таким образом в смысле зимней температуры дело обстоит хорошо. Затем летняя температура, которая имеет громадное значение, оказалась также буквально совпадающей. Для острова „Принца Эдуарда" плюс 15°, для Минска плюс 15,5°, для Борисова плюс 15,5°.

Что же касается среднего количества осадков, т.-е. влажности, выраженной в милиметрах, то оказалось, что у нас в Минске, весной, выпадает 146, за лето 286 милиметров, зимой 116, в Борисове 137—весной, 244 летом, 233 осенью и 111 зимой.

Из приведенных мною климатических данных показывает нам, что климат нашей Белоруссии, в особенности ее северных районов, мало чем отличается от климата родины серебристо-черной лисицы и ондатры. Приведенные цифровые данные проф. А. Федюшина о количестве осадков, т.-е. влажности, что самое существенное при пушном звероводстве, свидетельствуют о том, что предполагаемая нами работа по разведению серебристо-черных лисиц и ондатры, со стороны климатич ских условий препятствий встретить не может.

Однако, встречается еще одно препятствие по разведению ондатры, так как многие научные работники доказывают, что ондатра принадлежит к породе грызунов и при той плодовитости, какую имеют ондатры (самки выводят от 3 до 4 раз в год и от 12 до 20 штук молодняка за один раз), если ее выпустить на волю, то при быстром ее размножении она может, не находя себе пропитания, набрасываться на огородные и полевые посевы, чем можно повредить сельскому хозяйству, и, что охотничья масса Белоруссии, не сумеет отстреливать того нужного количества ондатр, которое бы дало возможность ондатре держаться в более отдаленных местностях от сельского хозяйства, как, например, в болотах, озерах и реках.

Однако, это опасение также нереально, и доводами для отказа от ввоза ондатры служить не может. Во-первых, еще ни в одной стране не было случаев, где бы ондатра стала вредителем сельского хозяйства, за исключением Чехо-Словакии, где в силу климатических условий мех ондатры оказался слишком дешевым и почти непригодным к употреблению, а значит в охотничьем населении не стало заинтересованности вести охоту на нее. Во-вторых, у нас в Белоруссии, при наличии колоссального количества болот, рек и озер (а ондатра особенно далеко от воды не идет) имеется также достаточное (даже сверх того) количество хищников, уничтожающих ондатру, как-то: лисица, ястреб, сова, выдра и норка, а также при той ценности шкурки ондатры, какой она обладает теперь, охотники будут также усиленно проводить на нее охоту, поэтому и эти мотивы являются не весьма важными.

Но все-таки, учитывая этот момент, мы считаем пока вести ондатровое

хозяйство в полной неволе, т.-е. в хорошо оборудованных ондатровых питомниках, откуда бы ондатра не могла попасть на свободу и только по изучению этого вопроса в РСФСР поставить вопрос о разведении ее у нас.

Кролиководство имеет достаточный опыт и подготовленный обслуживающий персонал, и поэтому оно вводится в нашей системе, как источник дохода для оказания финансовой помощи тем видам звероводства, которые требуют длительного изучения и колоссальных затрат.

На кролиководство нужно будет обратить серьезное внимание не для того, чтобы сосредоточивать громадное количество кроликов в питомниках и делать крупные заводы их, а для того, чтобы как можно быстрее и шире продвинуть дело кролиководства в более мелкие коллективные хозяйства.

Вопрос с остальными видами зверя, как-то: песцов, куниц, норки и выдры, должен по нашей системе пройти в стадии изучения возможности размножения их в питомниках и, если окажется возможным и выгодным, содержать их в специальных питомниках, тогда только будет приступлено к сооружению отдельных питомников для тех видов зверя, которые окажутся более выгодными и уживчивыми с человеком.

Мне зададут вопрос, почему промышленное пушное звероводство должно итти именно по линии охотничьей кооперации, а не по другим какими либо системам кооперации или организации? Я постараюсь ответить сейчас, чтобы вторично не возвращаться к этому вопросу, а именно потому, что мы, охотничья кооперация, связанная тесно с ведением охотничьего хозяйства, что крайне родственно одно другому, это—во-первых, во-вторых, мы, охотники, знающие, как никто больше, всю жизнь зверя на свободе, его ходы, пищу, местность и т. д.

Все приведенные мною мероприятия по промышленному пушному звероводству потребуют колоссальных затрат средств, которыми сейчас охоткооперация не обладает, ибо устройство одного питомника серебристо-черных лисиц, расчитанное на 20 клеток при 5 парах племенного материала, обойдется в 26700 руб., одного ондатрового питомника, расчитанного на 100 пар со 100 парами племенного материала, обойдется в 14500 рублей, устройство одного кролятника, расчитанного для постоянного содержания до 800 кроликов со 100 парами племенного материала, обойдется в 17300 рублей и одного общего питомника для песцов, куницы, норки и выдры, расчитанного на одну пару каждого вида зверя и при одной паре каждого из них племенного материала, обойдется в 10500 руб., а всего на 5 лет потребуется для одних питомников 280.830 рублей.

Правда, эта цифра предположительная, но она не может ни в коем случае измениться в сторону уменьшения. Мы, конечно, такими средствами не обладаем. И для этой цели охотничья кооперация, безусловно, все те средства, которыми она обладает, вложить в промышленное звероводство не может, она вложит то, что ей будет посильно, но наравне с этим, на помощь охотничьей кооперации, должно притти государство и другие заинтересованные органы, ибо быстрейший темп развития пушного звероводства зависит не только от той энергии и силы, которую охотничья кооперация вложит в это дело, но и от наличия средств. Государство так же, как и мы в этом заинтересовано и оно должно оказать содействие охоткооперации в изыскании потребных средств. Окружные и районные аппараты нашей кооперации теперь же должны приступить к работе по сосредоточению всех специалистов-звероводов, как любителей, так и профессионалов, также заблаговременно подыскать более удобные местности для устройства питомников для отдельных видов зверя.

Вся охотничья масса должна способствовать развитию пушного звероводства.

Ив. Докудовский.

О серебристых лисицах.

Расширявшееся с каждым годом добывание драгоценных меховых зверей, и необычайное уменьшение их запасов на земном шаре, около 40 лет тому назад, в Америке, в среде канадских предпринимателей породили мысль относительно взращивания этих зверей в неволе. Первые опыты были произведены с серебристыми лисицами или, как их в Америке называют, — черными лисицами. Потом шли лисицы голубые, болотные выдры, скунсы, куницы и т. д.

Нас в данном случае интересуют серебристые лисицы, поскольку возможность взращивания в неволе уже доказана долголетней практикой и поскольку это дело не только приносит огромный барыш предпринимателям, но и немалые доходы соответствующим государствам от экспорта шкурок этих весьма дорогих зверьков.

Серебристая лиса.

Несколько исторических и статистических данных разведения серебристых лисиц в неволе. Первые опыты канадцев были неудачны потому, что сначала трудно было получить от этих зверьков приплод в неволе.

В последнее время, благодаря необычайному упорству и энергии, над какими опыты продолжались более 30 лет, некоему Дальтону, на острове Эдуард в Америке, удалось воспитать несколько пар этих лисиц. От них и происходят все существующие в настоящее время в мире и поддающиеся разведению в неволе серебристые лисицы. Дальтон на этом деле нажил миллионы долларов и, кроме того, за свои работы от английского правительства получил титул лорда. Пару своих лисиц Дальтон продавал по 15.000 долларов, и, несмотря на необычайно высокую их цену, спрос повышался с каждым годом. В настоящее время в Канаде имеется свыше 2700 лисьих ферм, а в Американских Соединенных Штатах—свыше 12.000 таких ферм.

Из числа европейских стран, две пары серебристых лисиц ввезла первой Норвегия в 1913 г., а к концу 1927 года эта страна имела уже 905 ферм с 7500 зверями. Еще до войны серебристые лисицы были ввезены в Швейцарию, Англию и Францию; с 1925 года интенсивным разведением этого зверя занялись немцы. В течение трех лет в Германии возникло 117 ферм, из коих наибольшая цифра падает на Баварию (36), где в южной ее части воспитанием серебристых лисиц занялись состоятельные крестьяне, будь то единолично или об'единениями. Восточная Пруссия насчитывает 15 ферм, Саксония 11 ферм, при чем владельцами этих ферм являются главным образом крупные землевладельцы. За короткий период времени, немцы делу разведения серебристых лисиц уделили много внимания, создали особый союз лисоводов и издают два производственно-профессиональных журнала. Как и правительств других стран, правительство Германии все дело воспитания серебристых лисиц в неволе окружило вниманием, интересуется этим и предпринимателям оказывает самое широкое моральное и материальное содействие.

В какой степени интересуются этим делом другие страны, свидетельствует то обстоятельство, что к настоящему времени Северо-Американские Штаты, правительства Канады и Англии в своих министерствах земледелия открыли специальные отделы по воспитанию серебристых лисиц и других благородных пушных зверей.



Лисицы в неволе.

Недавно также организованы питомники серебристых лисиц в Чехо-Словакии; венгерское правительство открыло государственный питомник этих зверей недалеко от Будапешта. По несколько ферм имеют также Эстония и Финляндия. Польша к настоящему времени имеет только одну частную ферму на Горным Шленску под Котовицами, принадлежащую неким Зейделу и Гоффману.

Воспитание серебристых лисиц имеет огромное значение для каждой страны. Цель—получение от этих зверьков первосортной продукции—шкурок. Однако, поскольку сегодня необычайно расширяется дело разведения их, и наблюдается хороший спрос, торговля сводится, главным образом, к купле-продаже породистого материала для целей организации все новых и новых питомников. Это вполне понятно, если иметь в виду, што хорошая пара серебристых лисиц, в наши дни, стоит от 1500 до 2500 рублей золотом, а за штуку наилучших европейских экземпляров, в зависимости от ее качества, платят до 500 рублей золотом и выше.

Весь секрет воспитания серебристых лисиц в неволе заключается в наилучшем подборе живого материала, умении ухода за ним, характере корма и гигиеничном размещении этих зверей. Несмотря на то, что, как показала практика, получение в неволе хорошего приплода от серебристых лисиц—дело не легкое, тем не менее, само предприятие представляется очень выгодным и, во всяком случае, выгоднее ежели взращивание в неволе других зверей. В Германии уже есть такие предприниматели, которые посвятили себя этому делу целиком и забросили свои другие дела.

Пометы щенят по количеству бывают разные. Некоторые самки мечут по 4 и более щенят, другие 1-2. Во всяком случае, как минимум, средний приплод можно считать в 2-3 лисят на племенную пару. При подборе племенного материала нужно иметь в виду, что серебристый лис-производитель является зверем, главным образом, однобрачным, живет только в постоянных парах, в питомниках нельзя иметь одного производителя на две самки и поэтому ввозить и содержать их нужно только парами.

Как везде, так и у серебристых лисиц, только хорошо подобранный материал дает хороший приплод, поэтому, при начале дела нужно на эту сторону обратить особое внимание.

При наших широчайших возможностях разведению серебристых лисиц должно быть уделено внимание.

Жук.

Сваячасовае пытаньне.

(Да артыкулу тав. В. Данькова „Пэрспэктывы разьвіцьця паляўнічае гаспадаркі").

У сваім артыкуле тав. Данькоў высоўвае чатыры пытаньні, ад якіх залежыць аднаўленьне нашае паляўнічае гаспадаркі. І бязумоўна—ад пасьпяховага і практычнага вырашэньня гэтых пытаньняў будзе залежаць паляпшэньне паляўнічае гаспадаркі. Але да высунутых пытаньняў тав. Данькоў дае мала практычных паказаньняў, каб іх ажыцьцявіць.

